# ЦЕПЛЫНЯ ПРЫГАЖОСЦІ

**20 жніўня ва ўлюбёным месцы адпачынку гродзенцаў – парку Жылібера, каля яго галоўнага фантана адбыўся музычна-паэтычны вечар «Дыханне лета». У насычанай праграме імпрэзы выступілі гродзенскія паэтэсы Таццяна Сучкова, Таццяна Лашук і Кацярына Каламійцава-Ігнацюк.**




Арганізатары музычна-паэтычнага вечара «Дыханне лета» – Дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма горада Гродна» і Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры.

Для сучасных літаратараў няма нічога незвычайнага ў тым, што ў цёплы час паэзія выходзіць з закрытых памяшканняў «у народ» – на вуліцы горада, у сады і паркі. А вось гараджане напэўна не чакалі пачуць паэзію сучасных гродзенскіх аўтараў пад шум фантана. Лета... Гэта чароўная пара багатая на прыемныя сустрэчы і яркія сюрпрызы. Таму запрашэнне адміністрацыі ЦБС г. Гродна выступіць у парку Жылібера ля фантана Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі было з задавальненнем прынята, як вельмі сімпатычны летні сюрпрыз.

Усіх, хто прыйшоў у парк у гэты суботні вечар, на літаратурнай пляцоўцы чакала шмат цікавага і карыснага: выставы кніг і кветак; майстар-класы па вырабу сувеніраў; захапляльныя і пазнавальныя віктарыны. Сапраўдным упрыгожаннем вечара сталі музычныя нумары – папулярныя песні ў выкананні салістаў дзіцячай эстраднай студыі «Забава». Дарэчы, нягледзячы на назву студыі, яе выхаванцы ставяцца да мастацтва сур'ёзна. Любяць эксперыменты. Іх гатоўнасць выступіць не дзе-небудзь у зале, на сцэне, а ў гарадскім парку ля фантана – доказ таму.

Тое ж самае можна сказаць і пра гродзенскіх паэтэс. Зусім іншая справа – выступіць у гарачы дзень ля фантана, а не ў звыклых сценах бібліятэк, школ, універсітэтаў, не для традыцыйнай, падрыхтаванай аўдыторыі, а перад людзьмі, якія, магчыма, не чакалі пачуць тут паэзію. Смела і цікава. Усё супала ў адзіны эстэтычны сюжэт, у адну кампазіцыю – матыў летняй спёкі; вобраз гарадскога парку; вобраз фантана, празрыстыя бруі якога, бліскаючы ў промнях сонца, нясуць свежасць, прахалоду і ствараюць рамантычную

атмасферу камфорту, фізічнага і вядома, душэўнага. Напэўна, гэта і прынята метафарычна называць «дыханнем лета».

Першым паэтычным блокам (або «літаратурным уздыхам» летняга парку) было выступленне Таццяны Лашук. Гродзенская паэтэса, член СПБ прачытала цыкл уласных беларускіх вершаў «Дзеяслоў сэрца», які быў апублікаваны ў часопісе «Полымя». Рэакцыя слухачоў на выступленне Таццяны была выказана ў адным кароткім слове – «яшчэ!». Гэта рэакцыя на версію традыцыйнай беларускай сціпласці – сцісласць. І калі прыгажосць можа быць сціплай, то ёй лепш не быць кароткай, сціслай. А вялікай і магутнай у ідэале. Інакш яна проста не зможа выратаваць свет.



**Член СПБ, паэтэса Таццяна Лашук прачытала цыкл сваіх беларускіх вершаў «Дзеяслоў сэрца»**

***

У праграме музычна-паэтычнай вечарыны «Дыханне лета» выступіла лаўрэат IV абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі ў намінацыі «Дзіцячая літаратура», член СПБ, паэтэса Таццяна Сучкова. Таццяна Аркадзьеўна прадэкламавала нізку вершаў са сваёй кнігі для маленькіх чытачоў «Ты куда бежишь, тропинка?». Паэтэса вядомая як аўтар шматлікіх твораў і выданняў для самых маленькіх аматараў літаратуры, іх настаўнікаў і бацькоў, а яе творы ўключаны ў школьную праграму. Прагучалі і вершы паэтэсы на беларускай мове.




***

Кацярына Каламійцава-Ігнацюк толькі пачынае свой шлях у мастацтве прыгожага слова. Хоць вершы піша з дзяцінства, да публічнай літаратурнай дзейнасці прыйшла параўнальна нядаўна. Але трэба зазначыць, даволі паспяхова. У гэтым годзе паэтэса стала лаўрэатам IV абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі ў намінацыі «Адкрыццё года». Выхад кніг, публікацыі ў друку і праца над сабой, над развіццём уласнага творчага патэнцыялу – усё гэта чакае Кацярыну ў самай бліжэйшай перспектыве. А пакуль – лета, парк, фантан, апладысменты…

***

Літаратурнае лета ў Гродне, як і каляндарнае, падыходзіць да фіналу. Яно прынесла і працягвае прыносіць шмат незвычайных, прыемных момантаў. За ўсё тое, што яно пакінула ў нашых сэрцах – святло творчай думкі і цеплыню прыгажосці, будзем яму ўдзячныя.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**

**На фота:** удзельнікі музычна-паэтычнага вечара «Дыханне лета», гродзенскія паэтэсы Таццяна Лашук, Таццяна Сучкова і Кацярына Каламійцава-Ігнацюк. Гродна, Парк Жылібера. 20 жніўня 2022 года.



**Лаўрэат IV абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі ў намінацыі «Адкрыццё года», паэтэса Кацярына Каламійцава-Ігнацюк**

